да слупа. І той пачынае: „акапаўся, абзавёўся сувязямі, п'еш і чашачкі ўніз перакульваеш".

Самагоншчыкі падзяляліся на ўчасткі. У кожнага *міліцыянта* быў свой участак — „і сыт, і п'ян, і нос у табацы".

Апошнім часам *міліцыянтаў* трохі прылюдзілі, далі эўрапейскую форму. Але ўсё роўна — абцасы зьбітыя, на каленях — „мяшкі", а пад вачыма — „торбы" ад змаганьня зь „зялёным зьмеем".

Беларусь, і асабліва Менск, пераўзыходзіць самыя разьвітыя краіны па колькасьці *міліцыянтаў* на чалавека. Гэта ня лічачы розных АМОНаў, спэцназаў, супэрсакрэтных ахоўных органаў. Каго ад каго бароняць?

## Міні

***Сяргей Шупа***

Слоўца *„міні-"* ўваходзіць у склад шмат якіх складаных словаў — *міні-бар*, *міні-дыск*, *міні-кампутар*, *міні-футбол*. Аднак калі сказаць проста *„міні"*, гэта будзе азначаць толькі адно — *міні-спадніцу*.

Спадніца *міні* зьявілася пасьля аднаго з найбольшых сацыяльных выбухаў — у канцы 60-х гадоў — і сама была немалым сацыяльным выбухам. Гэта была праява сэксуальнай рэвалюцыі, якая прайшлася тады трыюмфальным шэсьцем па нашых абшарах. *Міні* былі выклікам шэраму пурытанству савецкага грамадзтва, дзе нават інтымныя пачуцьці грамадзянаў кантраляваліся парткамамі, прафкамамі і працоўнымі калектывамі.

*Міні* давалі магчымасьць жанчынам адважна, агрэсыўна, безаглядна падкрэсьліць сваю жаноцкасьць, зьвярнуць на сябе ўвагу нават тады, калі ўсе іншыя сродкі не дапамагалі. *Міні* выклікала агульнае павышэньне колькасьці адрэналіну на душу мужчынскага насельніцтва. Цалкам магчыма, што хвалі папулярнасьці *міні* супадаюць у фазе з хвалямі павышэньня нараджальнасьці. Часам *міні* бываюць прычынаю драматычных здарэньняў, бо жанчына ў *міні* ў месцах аўтамабільнага руху стварае аварыйную сытуацыю.

Мода на *міні* часам суціхала, на іх месца прыходзілі розныя мідзі і максы — але хто пра іх памятае? *Міні-спадніца* сталася неўміручаю і сёньня ўжо амаль не залежыць ад праяваў моды. І каб пераканацца, што беларускія жанчыны — найпрыгажэйшыя ў сьвеце, трэба выйсьці на вуліцы сьпякотным летам.

## Могілкі

***Сяржук Сокалаў-Воюш***

Адзінае месца на сьвеце, дзе ўсе роўныя, — *могілкі*. Кожны мае аднолькава зямлі.

У Беларусі *могілкі* называюць яшчэ: могліцы, клады, пагост, цьвінтар, кладзішча. На *могілкі* ідуць на Радаўніцу і на Дзяды, ідуць у дні жалобы і проста, як кажуць, „да сваіх". „Нас можа зьнішчыць толькі той, — кажа герой старажытнай легенды, — хто знойдзе і разбурыць нашыя *магілы*". На адным пісьменьніцкім зьезьдзе Адам Мальдзіс распавёў, як шукаў ён на старых каталіцкіх *могілках* у вёсцы Валынцы *магілы* першых беларускіх дра-